6. *Крукоўскі, М. І.* Надзея надзей : Рэлігія і праблема адраджэння беларускай нацыянальнай культуры / М. І. Крукоўскі ; запісаў У. Траццякоў // Мастацтва. – 2001. – № 1. – С. 2–5.

7. *Крукоўскі, М. І.* Чалавек выключнага таленту : інтэрв'ю з прафесарам, доктарам філасофскіх навук М. І. Крукоўскім пра яго жыццёвы шлях / М. І. Крукоўскі ; запісала Т. М. Бабіч // Музычнае і тэатральнае мастацтва : праблемы выкладання. – 2005. – № 3. – С. 58–60.

*Складальнікі*
***І. І. Паус, В. М. Сакалова***

УДК 784.96(092)(476)

## ЧАЛАВЕК У МАСТАЦТВЕ

*Артыкул прысвечаны памяці заслужанага работніка культуры БССР С. І. Дробыша.*



### *СТАНІСЛАЎ ІОСІФАВІЧ ДРОБЫШ*

(17 сакавіка 1939 – 31 кастрычніка 2013), вядомы ў рэспубліцы і за мяжой хормайстар, педагог і прапагандыст народна-харавога мастацтва, заслужаны работнік культуры БССР, прафесар, загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Станіслаў Іосіфавіч нарадзіўся ў в. Заграддзе Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Маленькая вёска ў некалькі двароў сваёй школы не мела, таму, каб спазнаць плён навукі, прыходзілася хадзіць за дзесяць кіламетраў пехатой. Сям'я зведала і галоту, і нястачу: бацька загінуў у Вялікую Айчынную вайну, але маці выхавала годных і адукаваных людзей. Сястра Станіслава Іосіфавіча была першая з вёскі, хто атрымаў вышэйшую адукацыю, і менавіта яна прывозіла з горада новыя песні, якія з вялікай асалодай завучваліся і спяваліся перад мясцовымі слухачамі.

Станіслаў Іосіфавіч марыў звязаць жыццё са спевамі і паступіць у музычнае вучылішча, але трэба было здаваць сальфеджыа, што без спецыяльнай адукацыі было немагчыма. Станіслаў Іосіфавіч скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі і атрымаў спецыяльнасць бухгалтар-эканаміст. Падчас вучобы спяваў у народным хоры Палаца культуры прафсаю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заў. Пасля размеркавання працаваў на Мінскім аўтамабільным заводзе, але сувязь з мастацтвам не страчваў – удзельнічаў у Народным тэатры, арганізаваў народны хор Дома культуры будтрэста № 5.

Настойлівасць і натхнёнасць таленавітай і шматграннай асобы ў рэшце рэшт зрабілі мару дасягальнай. Пераломным момантам стала сустрэча з кампазітарам Алоўнікавым, якая дала ўпэўненасць у правільнасці абранага шляху. Станіслаў Іосіфавіч скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі, а пасля і Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А. В. Луначарскага па класе харавога дырыжыравання.

У 1964 г. С. І. Дробыш быў запрошаны кіраўніком народнага хору ў Дом культуры будаўнічага трэста і пачалася яго паспяховая прафесійная дзейнасць. У гэты перыяд Станіславу Іосіфавічу было прысвоена званне заслужанага работніка культуры БССР.

У 1977 г. яго запрашаюць на працу ў Мінскі інстытут культуры, дзе ствараецца новая спецыяльнасць «народна-харавыя спевы». Было прынята рашэнне прафесійна вучыць народнай манеры спеваў: народнае выкананне дагэтуль лічылася аматарскім. З гэтай нагоды ў 1981 г. была створана кафедра беларускай народна-песеннай творчасці, нязменным загадчыкам якой да апошніх часоў свайго жыцця з'яўляўся Станіслаў Іосіфавіч.

У 1979 г. С. І. Дробыш стварае вакальна-харэаграфічны ансамбль «Валачобнікі» – сапраўдную майстэрню па вывучэнні і прапагандзе беларускага фальклору. Гэта быў першы калектыў, які пачаў папулярызаваць народнае відовішча. Рэпертуар узбагачаўся матэрыялам з усёй Беларусі. Асабістым гонарам і дасягненнем Станіслава Іосіфавіча з'явілася выкарыстанне выключна беларускамоўнага рэпертуару. Сёння ансамбль добра вядомы ў Беларусі і за яе межамі: у Расіі, Эстоніі, Польшчы, Германіі, Францыі, ЗША, Балгарыі, Іспаніі, Венгрыі. Удзельнік і пераможца міжнародных фестываляў традыцыйных культур у Балгарыі, Італіі, Бельгіі, Нідэрландах, Германіі. Станіслаў Іосіфавіч – не толькі кіраўнік, але і аўтар шматлікіх канцэртных праграм, вакальна-харэаграфічных пастановак ансамбля.





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Прафесар Станіслаў Іосіфавіч Дробыш выхаваў вялікую плеяду вучняў, якія працягваюць яго справу. Гэта вядомыя артысты, кіраўнікі творчых калектываў, грамадскія дзеячы.

Сярод выхаванцаў калектыву – заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Наталля Раманская, саліст ансамбля народнай музыкі «Бяседа» Белтэлерадыёкампаніі Валянцін Кірыленка, артыстка Нацыянальнага акадэмічнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі Наталля Конюх, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Валянціна Гладкая, знакаміты музыкант, лідар этна-трыа «Троіца» Іван Кірчук і іншыя творчыя таленавітыя асобы.

За педагагічную, грамадскую і яскравую творчую дзейнасць, адраджэнне, захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускай нацыянальнай культуры, а таксама ўклад у выхаванне творчай моладзі Станіслаў Іосіфавіч узнагароджваўся ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі. За шматгадовую плённую педагагічную дзейнасць, значны ўклад у развіццё культуры ўзнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі».

Станіслаў Іосіфавіч з’яўляўся членам камісіі Міністэрства культуры па прысваенні званняў «заслужаны» аматарскім калектывам; членам экспертнай камісіі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі па прысваенні прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці; членам журы гарадскіх і рэспубліканскіх фестываляў народнай творчасці; членам Экспертнай камісіі Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па прызначэнні стыпендый і грантаў таленавітай моладзі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Станіслаў Іосіфавіч Дробыш унёс вялікі ўклад у развіццё культуры Беларусі, яго справа працягваецца ў вучнях, таму яго душа, яго павага да роднага слова, любоў да сваёй культуры і мовы жыве і будзе ўвасабляцца ў беларускай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ